# АСНОЎНЫЯ ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ДЗЕЙНАСЦІ УК «ВІЦЕБСКІ АБЛАСНЫ КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ»

**Г. У. Савіцкі,**
*дырэктар Віцебскага абласнога краязнаўчага музея*

Установа культуры «Віцебскі абласны краязнаўчы музей» з’яўляецца адным са старэйшых музеяў у Беларусі, ён заснаваны ў 1918 г., а радавод свой вядзе з канца XIX ст. Па колькасці музейных прадметў асноўнага фонду на сённяшні дзень музей другі ў краіне – каля 200 тысяч прадметаў, навукова-дапаможны фонд уключае больш за 50 тысяч прадметаў. Музей складаецца з пяці філіялаў: Ратуша, дзе змешчана гістарычная і прыродазнаўчая экспазіцыі; Мастацкі музей; Музей прыватных калекцый; музей-сядзіба І. Я. Рэпіна «Здраўнёва»; Музей памяці патрыётаў Віцебшчыны (у будынку былой турмы СД). Штогод музей, разам з філіяламі, наведвае больш за 150 тысяч чалавек. Музеем вядзецца актыўная праца па ўсіх традыцыйных кірунках музейнай дзейнасці, сярод іх асноўнымі застаюцца: экспазіцыйна-выставачная, навукова-даследчая, навукова-метадычная дзейнасць і работа з наведвальнікамі.

Адсутнасць пастаяннай экспазіцыі кампенсуецца актыўнай выставачнай дзейнасцю музея на аснове сваіх фондавых калекцый. На працягу года ў музеі і філіялах праводзіцца ў сярэднім каля сотні выстаў [4, с. 8, 5, 10], большасць з іх мастацкія і дакументальныя. Апрача гэтага, ладзяцца доўгатэрміновыя фондавыя выставы з прадметаў найбольш цікавых і рарытэтных калекцый. Удалымі атрымаліся праекты: «Случайная находка», «Привычки милой старины», «Масонская калекцыя В. П. Федаровіча», якая стала пераможцам на Міжнародным фестывалі музеяў «Інтэрмузей 2011» у Маскве.

Музей актыўна ўдзельнічае ў разнастайных конкурсах і фестывалях. Сярод апошніх дасягненняў у гэтым кірунку прэмія «За ўмацаванне прэстыжу музейнай прафесіі» на Міжнародным фестывалі музеяў «Інтэрмузей 2011» у Маскве. Зараз вядзецца падрыхтоўка да ўдзелу ў падобным фестывалі, які адбудзецца ў 2012 г. у Мінску.

Належная ўвага ў музеі надаецца і навукова-даследчай дзейнасці, у прыватнасці, у галіне вывучэння калекцый, работы з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

наведвальнікамі, гісторыі музея і гісторыі рэгіёна. Вынікамі даследаванняў становяцца навуковыя канцэпцыі выстаў, метадычныя распрацоўкі экскурсій і музейна-педагагічных заняткаў, публікацыі і выступленні на навукова-практычных канферэнцыях.

Традыцыйным стала правядзенне ў музеі штогадовай навукова-практычнай канферэнцыі «Віцебскія старажытнасці», якая становіцца своеасаблівай справаздачай аб навуковай дзейнасці за год і пляцоўкай для абмену думкамі і меркаваннямі наконт сучаснага стану і перспектыў. Тэматыка выступленняў даволі шырокая, але ў асноўным звязана з Віцебшчынай і сумежжам. Па выніках канферэнцыі выдаецца зборнік матэрыялаў.

Дарэчы адзначым, што выдавецкая дзейнасць з’яўляецца неад’емнай часткай station ўчага іміджу ўстановы. Сярод выданняў музея і разнастайныя рэкламныя буклеты з інфармацыяй пра музей, і каталогі выстаў і калекцый, і наборы паштовак, і вышэйзгаданыя зборнікі навуковых канферэнцый.

Згодна са Статутам музея важным кірункам дзейнасці з’яўляецца навукова-метадычная праца з музеямі рэгіёна, праблемай якой з’яўляецца з цяжкасцю выкараняльны кансерватызм – фармалізм у працы і звядзенне яе ў асноўным да збору статыстычных звестак і давядзення да музеяў новых нарматыўных актаў. Лепшы вопыт метадычнай працы ў першую чаргу звязаны з распрацоўкай метадычных рэкамендацый па падрыхтоўцы і правядзенні экскурсій, музейна-педагагічных заняткаў.

Як паказвае практыка, традыцыйныя формы работы з наведвальнікамі, такія як экскурсія, лекцыя, і сёння застаюцца найбольш запатрабаванымі. Але пашырэнне аўдыторыі музея ўсё ж звязана з разнастайнымі аднаразовымі мерапрыемствамі кшталту ночы музеяў і музейных святаў. Мела поспех сярод жыхароў горада акцыя «Ладзім выставу разам. Цацкі майго маленства», якая праводзілася ў філіяле Літаратурны музей і вынікам якой стала выстава дзіцячых цацак [3, с. 5]. Таксама ў гэтых мэтах музей актыўна супрацоўнічае са сродкамі масавай інфармацыі: публікацыі і рэпартажы аб мерапрыемствах у музеі рэгулярна з’яўляюцца ў друку, на тэлебачанні і ў глабальнай сетцы. Музей арганізоўвае шмат выязных музейна-педагагічных заняткаў і лекцый у навучальных установах і дзіцячых садах, што ў цэлым характэрна для абласных музеяў [1].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У апошні час шырыцца дзейнасць па прыцягненні дадатковых фінансавых сродкаў, так званы «музейны фандрэйзінг»: гэта і арэнда, і камерцыйныя праекты, і проста спонсарская дапамога, значную частку складае продаж сувенірнай прадукцыі, што аднначасова дапамагае і рэкламе музея. Вытворчасцю дадзенай прадукцыі займаюцца разнастайныя прадпрыемствы як дзяржаўнай, так і недзяржаўнай формы ўласнасці па дамоўленасці з музеем.

Сярод праектаў, разлічаных на прыбытак, найбольш карыснымі ў гэтым кірунку з'яўляюцца так званыя камерцыйныя выставы. Звычайна гэта відовішчныя праекты з папулярнай тэматыкай, разлічаныя на масавага наведвальніка. Характэрна, што спачатку яны праводзяцца ў сталіцы, а потым – у рэгіёнах, такім чынам ахопліваючы ўсю рэспубліку. Колькасць такіх праектаў як мінімум адпавядае абавязковаму паказчыку платных паслуг.

Апошнім часам музей актыўна арганізоўвае выязныя выставы ў рэспубліканскіх і абласных музеях, як, напрыклад, выстава работ знакамітага віцебскага мастака Юдэля Пэна з калекцыі нашага музея, якая прайшла ў Мінску і ўсіх абласных цэнтрах, акрамя Брэста. Фактычна музей стаў арганізатарам праектаў абменных выстаў, пачаткам якіх стаў абмен выставамі з Гродненскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеем. Потым падобны праект быў арганізаваны з Гомельскім палацава-паркавым ансамблем. У першую чаргу такія выставы разлічаны на папулярызацыю калекцый музея, пашырэнне яго станоўчага іміджу, разам з тым яны могуць прыносіць і дадатковыя фінансавыя сродкі.

Існуе ў музеі і шэраг праблем матэрыяльна-тэхнічнага плану: недахоп сучаснага экспазіцыйнага абсталявання, патрэба ў мадэрнізацыі і замене састарэлай камп'ютарнай базы, неабходнасць штогод выдаткоўваць сродкі на рамонт будынкаў музея, таму што ўсе яны з'яўляюцца помнікамі архітэктуры і ўнесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. У сувязі з гэтым абмяжоўваецца набыццё прадметаў музейнага значэння, пакупка спецыяльнай літаратуры; папаўненне музейных фондаў вядзецца хаатычна, нягледзячы на існуючыя планы камплектавання; з-за недахопу сродкаў складана ладзіць навуковыя экспедыцыі і камандзіроўкі.

Кадравая праблема ў значнай ступені абумоўлена невялікімі заробкамі музейных работнікаў, з прычыны чаго спецыялісты ў

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

штаце музея не затрымліваюцца, а сярод яго навуковых супрацоўнікаў не ўсе маюць належную адукацыю і ўзровень падрыхтоўкі. Дадзены фактар, на жаль, адбіваецца і на якасным складзе паступаючых у ВНУ па спецыяльнасці музеязнаўства: са слабых студэнтаў атрымоўваюцца маладыя спецыялісты, якія слаба арыентуюцца ў музейнай дзейнасці, часам не валодаюць нават методыкай даследаванняў. Безумоўна, паступова сітуацыя выпраўляецца, шмат намаганняў прыкладаецца па фарміраванні кадравага саставу, прыцягненні спецыялістаў, якія з захапленнем прафесійна займаюцца музейнай справай.

У перспектыве Віцебскі абласны краязнаўчы музей мае намер далей пашыраць музейную сетку за кошт стварэння новых філіялаў і змены профілю існуючых. У галіне навукова-даследчай і метадычнай дзейнасці мяркуецца стварэнне сумеснага, разам з гістфакам Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, навукова-даследчага і практычнага цэнтра (на базе музея) па пытаннях музеязнаўства; выданне навукова-метадычнага штогодніка па актуальных праблемах музейнай справы; правядзенне справаздачнай навуковай канферэнцыі для музеяў вобласці.

Па рашэнні калегіі ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама ў хуткім часе павінна адбыцца стварэнне, у дадатак да існуючага сайта, віртуальнага музея на аснове калекцый Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.

Таксама робяцца захады па арганізацыі пры музеі рэстаўрацыйных майстэрань, неабходнасць у якіх наспела даўно, але з-за недахопу сродкаў і кваліфікаваных кадраў справа рухаецца марудна.

Адбыліся папярэднія дамоўленасці аб рабоце ў музеі аўдыягідаў і размяшчэнні інфакіёскаў дзеля падвышэння ўзроўню музейнага абслугоўвання.

Музей не перарывае працы з мэтай паляпшаць усе кірункі сваёй дзейнасці, больш увагі надаваць навукова-фондавай рабоце, сістэматычнаму папаўненню фондаў, цалкам выконваць галоўную функцыю захавання, вывучэння і папулярызацыі гісторыі і культуры Віцебшчыны.

1. *Кисляк, О.* Музеи превращаются в склады: [о музеях Могилева] / О. Кисляк // СБ. Беларусь сегодня. – 2011. – 11 ноябр. – С. 8.

2. *Справаздача* аб дзейнасці УК «Віцебскі абласны краязнаўчы музей» за 2007 г. // Навуковы архіў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*3. Справаздача* аб дзейнасці УК «Віцебскі абласны краязнаўчы музей» за 2008 г. // Навуковы архіў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.
*4. Справаздача* аб дзейнасці УК «Віцебскі абласны краязнаўчы музей» за 2009 г. // Навуковы архіў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.
*5. Справаздача* аб дзейнасці УК «Віцебскі абласны краязнаўчы музей» за 2010 г. // Навуковы архіў Віцебскага абласнога краязнаўчага музея.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ